Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

37 (7363) | Субота, 24 лютага 1945 г. | Цана 20 кап.

Войскі 1-га Беларускага фронта, пасля месячнай асады і ўпорных баёў, завяршылі разгром акружанай групіроўкі праціўніка і 23 лютага поўнасцю авалодалі горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ—стратэгічна-важным вузлом абароны немцаў на Берлінскім напрамку.

У ходзе баёў у ПАЗНАНІ войскі фронта ўзялі ў палон 23.000 нямецкіх салдат і афіцэраў на чале з камендантам крэпасці генерал-маёрам Матэрн і яго штабам, а таксама захапілі вялікую колькасць узбраення і ваеннай маёмасці.

ЗАГАД

Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

Камандуючаму войскамі 1-га Беларускага фронта
Маршалу Совецкага Саюза ЖУКАВУ
Начальніку штаба фронта
Генерал-палкоўніку МАЛІНІНУ

Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта, пасля месячнай асады і ўпорных баёў завяршылі разгром акружанай групіроўкі праціўніка і сёння, 23 лютага, поўнасцю авалодалі горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ—стратэгічна-важным вузлом абароны немцаў на Берлінскім напрамку.

У ходзе баёў у ПАЗНАНІ войскі фронта ўзялі ў палон 23.000 нямецкіх салдат і афіцэраў на чале з камендантам крэпасці генерал-маёрам МАТЭРН і яго штабам, а таксама захапілі вялікую колькасць узбраення і ваеннай маёмасці.

У баях за авалоданне горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ вызначыліся войскі генерал-палкоўніка ЧУЙКОВА, генерал-лейтэнанта ДУХАНАВА, генерал-лейтэнанта ВОЛКАВА, генерал-маёра БЕЛЯЎСКАГА, генерал-маёра ШЭМЯКІНА, генерал-маёра артылерыі ХЕТАГУРАВА, генерал-маёра ГЛЕБАВА, генерал-маёра БАКАНАВА, генерал-маёра КАБЕРЫДЗЕ, генерал-маёра МАЙСЕЕЎСКАГА, палкоўніка МАРЧАНКА, артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі ПАЖАРСКАГА, генерал-маёра артылерыі РАЖАНОВІЧА, генерал-маёра артылерыі ЛЕБЯДОЎСКАГА, генерал-маёра артылерыі СЕРЭДЗІНА, палкоўніка ФАНТАЛАВА, палкоўніка ПАСЬКО, палкоўніка ПРАЗОРАВА, палкоўніка ВІНАГРАДАВА, палкоўніка ЕГОШЫНА, палкоўніка ЦАРЭЎСКАГА, палкоўніка ПАЦЁМКІНА, палкоўніка ВАЛЬЧАНКА, палкоўніка РУСАНАВА, палкоўніка ЦАРЭВА, палкоўніка ШЭЎЧЭНКА, палкоўніка КАЗУБА, палкоўніка ПАЧЫТАЛАВА, падпалкоўніка МІХАЙЛОЎСКАГА, падпалкоўніка АНАШКІНА, падпалкоўніка СКВАРЦОВА; танкісты генерал-маёра танкавых войск ВАЙНРУБА, палкоўніка ЕРАМЕЕВА, палкоўніка СМЕЛЬЧЭНКА, падпалкоўніка ЛАБАНАВА, падпалкоўніка ІВАНЮКА, падпалкоўніка ЛУКША, маёра ІВАНОВА, маёра КІБАЛЬ, маёра ГЕРЦЭВА, маёра ВЕЙСМАНА; лётчыкі генерал-маёра авіяцыі КАМАРОВА, палкоўніка ЯХАБСОНА, падпалкоўніка НОВІКАВА, падпалкоўніка ЛЫСЕНКА, падпалкоўніка ВОЛКАВА, падпалкоўніка ЛЕОНАВА, падпалкоўніка ВАСІЛЬЕВА, маёра АБРОСКІНА; сапёры генерал-маёра інжынерных войск ТКАЧЭНКА, генерал-маёра інжынерных войск ВОРАНАВА, падпалкоўніка КУЗНЯЦОВА, палкоўніка ПРУС, маёра СУДЗІЛОЎСКАГА, падпалкоўніка РАЖДЗЕСТЕЕНСКАГА, маёра МАХАВА, капітана МАНІКА; сувязісты палкоўніка ЧЭРКАСАВА, палкоўніка ТУПАЧЭНКА, маёра ПАЛАСМАК, маёра АРЛОЎСКАГА.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ, прадставіць да прысваення найменавання «ПАЗНАНЬСКІХ» і да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 23 лютага, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы МАСКВА ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 1-га Беларускага фронта, якія авалодалі горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ,—дваццаццю артылерыйскімі залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні АБ'ЯЎЛЯЮ ПАДЗЯКУ кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне ПАЗНАНІ.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

23 лютага 1945 года
№ 284

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.

У імя канчатковага разгрому ворага

Учора народы Совецкага Саюза адзначылі знамянальную ў жыцці Совецкай дзяржавы дату — 27-ю гадавіну Чырвонай арміі.

Народы Совецкага Саюза адзначылі 27-ю гадавіну Чырвонай арміі ў абстаноўцы яе бліскучых поспехаў, у яе свяшчэннай барацьбе за канчатковы разгром гітлераўскай Германіі. Аб гэтых поспехах з вычарпальнай паўнатой і яснасцю сказана ў загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна ад 23 лютага гэтага года. Увесь совецкі народ сустрэў загад свайго любімага правадыра, як выдатны гістарычны дакумент, які падводзіць вынікі велічных перамог Чырвонай арміі і мабілізоўвае ўсіх совецкіх людзей на барацьбу за канчатковы разгром гітлераўскай Германіі.

« 27-ю гадавіну Чырвонай арміі,—сказана ў загадзе таварыша Сталіна, — мы сустракаем цяпер у абстаноўцы новых гістарычных перамог над ворагам. Чырвоная армія не толькі вызваліла родную зямлю ад гітлераўскай нечысці, але і адкінула ворага на многія сотні кіламетраў за тыя рубяжы, з якіх немцы па-разбойніцку напалі на нашу краіну, перанесла вайну на тэрыторыю Германіі і цяпер разам з арміямі нашых саюзнікаў паспяхова давяршае справу разгрому нямецка-фашысцкай арміі».

У жорстких і няспынных баях Чырвоная армія вызваліла совецкія землі, вызваліла Польшчу і значную частку тэрыторыі Чэхаславакіі, вывела з вайны апошняга саюзніка Германіі ў Еўропе — Венгрыю, вядзе зараз баі па нямецкай тэрыторыі. Поспехі совецкага наступлення пазбавілі немцаў магчымасці прадпрыняць зімовае наступленне на захадзе супроць саюзных войск. Гэта ў сваю чаргу дало магчымасць нашым саюзнікам «перайсці ў наступленне супроць немцаў і тым самкнуць свае наступальныя аперацыі на захадзе з наступальнымі аперацыямі Чырвонай арміі на ўсходзе». (Сталін).

Аб сіле і размаху цяперашняга наступлення Чырвонай арміі сведчаць страты, нанесеныя нямецка-фашысцкай арміяй, і трафеі, захопленыя нашымі войскамі. Дастаткова сказаць, што за сорак дзён наступлення ў студзені—лютым гэтага года совецкія войскі выгналі немцаў з 300 гарадоў, захапілі да сотні ваенных заводаў, захапілі ў палон звыш 350 тысяч салдат і афіцэраў і не менш 800 тысяч знішчылі, знішчожылі і захапілі каля 3.000 нямецкіх самалётаў, больш 4.500 танкаў і самаходных гармат і не менш 12.000 гармат.

За тры з лішнім годы совецкія людзі добра пазналі немцаў, іх бандыцкую, разбойніцкую сутнасць, іх подлае, чалавеканенавісніцкае нутро. Мы навучыліся пасапраўднаму ненавідзець нямецкіх захопнікаў. Гэтая нянавісць вядзе совецкіх людзей на бой, на подвігі.

Немцы выхваляліся, што больш сотні год на нямецкай зямлі не было непрыяцельскага салдата і што нямецкая армія ваявала і будзе ваяваць толькі на чужых землях. Цяпер ад гэтай нямецкай фанабэрлівасці не засталося і следу, Чырвоная армія перанесла ваенныя дзеянні на іх тэрыторыю. Армія — вызваліцельніца, армія—помсніца штурмуе логава фашысцкага звера, пабеданосна ідзе па зямлі тых, хто заслужыў усеагульную пагарду і нянавісць чалавецтва, па зямлі нямецкіх захопнікаў. Яна вершыць справядлівы і суровы прысуд шматпакутных народаў над сваімі катамі — нямецкімі душагубамі.

Учора ў азнаменаванне вялікіх перамог, атрыманых узброенымі сіламі совецкай дзяржавы на працягу прайшоўшага года, разам з Масквой, Ленінградам, Кіевам, Сталінградам, Рыгай і іншымі вялікімі гарадамі Совецкага Саюза дваццаццю артылерыйскімі залпамі салютавала сталіца Совецкай Беларусі — горад Мінск. Кожны грамадзянін нашай рэспублікі ў гэты момант з асаблівай выразнасцю аднавіў у сваёй памяці шлях, пройдзены беларускім народам у гэтыя тры з лішнім ваенныя годы. Зноў і з новай сілай напоўніліся сэрцы нашых людзей гордасцю за той удзел, які прыняў і прымае беларускі народ у свяшчэннай Айчыннай вайне совецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сыны і дочкі беларускага народа з першых дзён вайны і па сёняшні дзень гераічна змагаюцца ў слаўных радах непераможнай арміі зямлі совецкай. Дзесяткам з іх прысвоена высокае званне Героя Совецкага Саюза. Тысячы з іх узнагароджаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Славай пакрылі свае баявыя спягі мужныя беларускія партызаны і партызанкі. Яны паказалі ўсяму свету велічны прыклад таго, як увесь народ, да канца верны вялікай справе Леніна—Сталіна, грудзьмі ўстаў на абарону сваёй радзімы і разам з другімі народамі многанацыянальнай совецкай дзяржавы адстаяў чэсць, свабоду і незалежнасць нашай цудоўнай Радзімы.

У сваім загадзе ад 23 лютага гэтага года Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін гаворыць:

«Поўная перамога над немцамі цяпер ужо блізка. Але перамога ніколі не прыходзіць сама,—яна здабываецца ў цяжкіх баях і ва ўпорнай працы. Асуджаны вораг кідае ў бой апошнія сілы, адчайна супраціўляецца, каб пазбегнуць суровай адплаты. Ен хапаецца і будзе хапацца за самыя крайнія і подлыя сродкі барацьбы. Таму трэба памятаць, што чым бліжэй наша перамога, тым вышэй павінна быць наша пільнасць, тым мацней павінны быць нашы ўдары па ворагу».

У гэтых сталінскіх словах — баявая праграма нашай дзейнасці, сэнс нашага сёняшняга жыцця.

Усе сілы народа — на справу канчатковай перамогі над ворагам, на поўны разгром гітлераўскай Германіі!

Задачы па канчатковаму разгрому гітлераўскай Германіі патрабуюць ад усіх нас яшчэ большага напружання сіл і энергіі. Яшчэ больш настойліва і энергічна павінны працаваць нашы людзі над адраджэннем разбуранай ворагам народнай гаспадаркі; з дня ў дзень прамысловасць павінна даваць усё больш і больш прадукцыі фронту і краіне; яшчэ больш бездакорнай павінна быць работа чыгуначнага транспарта; з дня ў дзень калгасы рэспублікі павінны даваць фронту і краіне ўсё больш і больш прадуктаў харчавання, а прамысловасці — сыравіны.

Беларускі народ, кіруемы загартаванай у баях комуністычнай партыяй большэвікоў Беларусі, нічога не пашкадуе для зававання канчатковай перамогі над ворагам, у імя свабоды, працвітання і шчасця сваёй дарагой маці — Радзімы.

Слава пабеданоснай Чырвонай арміі, арміі — вызваліцельніцы, якая выгнала нямецка-фашысцкіх захопнікаў з совецкай зямлі і громіць гітлераўскія войскі на тэрыторыі Германіі!

Пад сцягам Леніна, пад вядзіцельствам Сталіна — уперад за канчатковы разгром гітлераўскай Германіі, за поўную перамогу нашай справядлівай справы!

У Соўнаркоме СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР, разгледзеўшы вынікі ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва абласцей, краёў і рэспублік за выкананне планаў рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын у студзені 1945 года, прызнаў пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве наступныя абласці і рэспублікі, і пастанавіў:

1. Уручыць Пераходныя Чырвоныя сцягі Дзяржаўнага Камітэта Абароны і выдаць грашовыя прэміі:

Сталінскай абласці УССР,
Дніпрапятроўскай абласці УССР,
Беларускай ССР,
Саратаўскай абласці,
Крымскай АССР.

2. Адзначыць наступныя абласці і рэспублікі, якія выканалі планы рамонту трактараў і сельскагаспадарчых машын у студзені 1945 г.: Яраслаўскую, Горнаўскую, Іванаўскую, Свердлоўскую, Ленінградскую, Смаленскую абласці, Дагестанскую АССР, Карагандзінскую, Канчэтаўскую і Паўладарскую абласці Казахскай ССР.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 23 ЛЮТАГА

На працягу 23 лютага на паўднёвым захадзе ад КЕНІГСБЕРГА нашы войскі прадаўжалі баі па знішчэнню ўсходнепрускай групіроўкі праціўніка і, сціскаючы кальцо акружэння, авалодалі населенымі пунктамі АРНСТАЙН, ЛІХТЭНФЕЛЬД, ЛІЛІЕНТАЛЬ, ТОЛЬКСДОРФ, ЛІБЕНАУ, ШАЛЬМАЙ. У баях за 22 лютага ў гэтым раёне нашы войскі ўзялі ў палон каля 500 нямецкіх салдат і афіцэраў.

У ПАМЕРАНІІ нашы войскі, зламаўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі горадам і чыгуначным вузлом АРНСВАЛЬДЭ.

Войскі 1-га БЕЛАРУСКАГА фронта, пасля месячнай асады і ўпорных баёў, завяршылі разгром акружанай групіроўкі праціўніка і 23 лютага поўнасцю авалодалі горадам і крэпасцю ПАЗНАНЬ, — стратэгічна-важным вузлом абароны немцаў на Берлінскім напрамку.

У ходзе баёў у ПАЗНАНІ войскі фронта ўзялі ў палон 23.000 нямецкіх салдат і афіцэраў на чале з камендантам крэпасці генерал-маёрам МАТЭРН і яго штабам, а таксама захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 365, танкаў і самаходных гармат — 32, гармат — 584, мінамётаў — 177, кулямётаў — 4.490, вінтовак і аўтаматаў — звыш 30.000, бронетранспарцёраў — 36, аўтамашын — 3.260, матацыклаў — 409, радыёстанцый — 21, паравозаў — 193, вагонаў — 3,705, коней — 990. Праціўнік страціў толькі забітымі звыш 25.000 салдат і афіцэраў.

У раёне БРЭСЛАУ нашы войскі, прадаўжаючы бой па знішчэнню акружанай у горадзе групіроўкі праціўніка, занялі прыгарады ПАПЕЛЬХОФ, ГРОС РААКЕ, КЛАЙН РААКЕ, КЛАЙН БІШВІЦ, КЛАЙН МАЗЕЛЬВІТЦ і 20 кварталаў у паўднёвай частцы горада. У баях за 22 лютага ў гэтым раёне нашы войскі захапілі 130 нямецкіх гармат, сярод якіх 80 гармат вялікай магутнасці.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 22 лютага на ўсіх франтах падбіта і знішчана 105 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 14 самалётаў праціўніка.

БАЯВЫМІ СПРАВАМІ АДКАЗВАЕ БЕЛАРУСКІ НАРОД НА ЗАГАД ТАВАРЫША СТАЛІНА

(Паводле паведамленняў нашых карэспандэнтаў і БЕЛТА)

НЕБЫВАЛЫ ЎЗДЫМ

Вестка аб загадзе Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна з хуткасцю маланкі абляцела ўсе цэхі і будаўнічыя ўчасткі МГЭС № 2. Рабочыя, інжынеры і тэхнікі, раніцой праслухаўшы загад вялікага правадыра, вышлі на аднаўленне свайго прадпрыемства. З небывалым вытворчым уздымам людзі працавалі, не ведаючы стомленасці.

Напружанай, арганізаванай працай адзначыў дзень Чырвонай Арміі калектыў капельнага цэха. Рабочыя сваімі сіламі ўзяліся аднавіць паравы кацёл да 25 лютага. Многія з іх адпрацавалі па 24 гадзіны, не выходзячы з цэха. З пускам паравога катла электрастанцыя павялічвае сваю магутнасць у два разы.

— Нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі нашу электрастанцыю, — заявіў столяр Іваноў. — Мы гэтага ніколі не забудзем. Вось таму, пачуўшы загад таварыша Сталіна, які ярка асвятліў пабеданосны шлях гераічнай Чырвонай Арміі, мы абавязваемся сваёй самаадданай працай дапамагаць ёй канчаткова дабіць фашысцкага звера ў яго ўласнай бярлозе. Я маю пяць спецыяльнасцей і заклікаю рабочых авалодаць некалькімі будаўнічымі прафесіямі.

Аднаўленчыя брыгады механізіравалі работы на аб'ектах. Гэта ў значнай ступені паскарае аднаўленне асноўных цэхаў. За 15 дзён была адноўлена берагавая насосная станцыя. У зімовых умовах складзена сцяна, разбураная фашысцкімі бомбамі, якая злучае капельную з машынным залай. Брыгада каменшчыкаў, якая працуе на гэтым участку пад кіраўніцтвам майстра Варанога, штодзённа перавыконвае дзённае заданне на 200 процантаў.

Калектыў аднаўленцаў МГЭС, у адказ на загад таварыша Сталіна, аднадушна абавязаўся ў кароткі тэрмін адрадзіць свае прадпрыемства, каб даць ток установам, арганізацыям і жылым дамам Мінска.

Зменнае заданне выканалі на 200 процантаў

БАБРУЙСК. Па прадпрыемствах і ва ўстановах горада праходзяць мітынгі, прысвечаныя загаду таварыша Сталіна ў сувязі з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі. Учора раніцай на мэблевай фабрыцы імені Халтурына і на лесакамбінаце было арганізавана калектыўнае слуханне загада Вярхоўнага Галоўнакамандуючага.

Ва ўсіх цэхах мэблевай фабрыкі імені Халтурына прайшлі мітынгі. Стаханавец гэтага прадпрыемства тав. Кітаеў, выступаючы на мітынгу, сказаў:

— Загад нашага любімага правадыра, арганізатара і палкаводца доблеснай Чырвонай Арміі мы слухалі з вялікай радасцю і гордасцю за Чырвоную Армію, якая выратавала ад нямецкай няволі мільёны людзей. У сваім загадзе таварыш Сталін адзначыў бліскучыя поспехі Чырвонай Арміі, якая наступае на тэрыторыі Германіі. Увесь совецкі народ ганарыцца сваёй армілй.

У адказ на загад правадыра калектыў фабрыкі абавязаўся выканаць план першага квартала да 25 сакавіка і да 1 сакавіка асвоіць выраб новай мэблі. Рабочыя адлічылі дзённы заработак у фонд дапамогі сем'ям франтавікоў і арганізавалі збор падарункаў раненым байцам і афіцэрам.

На лесакамбінаце, пасля адбыўшагася мітынга, рабочыя дрэваапрацоўчага цэха выканалі зменнае заданне на 200 процантаў. Калектыў камбіната абавязаўся завяршыць квартальны план да 26 сакавіка і знізіць сабекошт прадукцыі на 5 процантаў.

У дзень свята працоўныя Бабруйска адправілі 10 тысяч пісьмаў байцам і афіцэрам, у якіх расказваюць аб сваіх працоўных справах і вітаюць слаўных абаронцаў Радзімы з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі.

Урачыстае паседжанне мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, прысвечанае 27-й гадавіне Чырвонай Арміі

Учора ў Акруговым Доме Чырвонай Арміі імені К. Е. Варашылава адбылося ўрачыстае паседжанне Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, прысвечанае 27-й гадавіне Чырвонай Арміі.

Сюды на свята доблеснай Чырвонай Арміі сабраліся байцы, афіцэры і генералы, стахановцы прадпрыемстваў горада, вучоныя, пісьменнікі, работнікі мастацтва, прадстаўнікі партыйных, совецкіх, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый.

Роўна ў 19 гадзін урачыстую цішыню залы нарушаюць гукі фанфар. За сталом прэзідыума паяўляюцца таварышы П. К. Панамарэнка, П. Я. Паталевіч, Н. В. Кісялёў, П. А. Левіцкі, В. Н. Малін, Т. С. Гарбуноў, Н. Е. Аўхімовіч, Г. Б. Эйдзінаў, В. І. Казлоў, К. І. Буларын, І. М. Ільюшын, А. С. Шаўроў, Г. С. Лахтанаў, В. Ф. Якаўлеў, П. І. Новікаў, члены бюро абкома і гаркома КП(б)Б, народныя камісары, генералы і афіцэры.

Урачыстае паседжанне адкрыў старшыня Выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тав. Бударын. Пад гром апладысментаў і буры авацый у ганаровы прэзідыум абіраецца Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза тав. Сталін, яго бліжэйшыя саратнікі — члены і кандыдаты Палітбюро ЦК ВКП(б).

З дакладам, прысвечаным 27-й гадавіне Чырвонай Арміі, выступіў член Ваеннага Совета Беларуска-літоўскай Ваеннай акругі генерал-маёр Новікаў.

Калі дакладчык гаворыць аб героях, паўшых у баях за свабоду і незалежнасць нашай радзімы, і слаўных палкаводцах Чырвонай Арміі Ватуціне і Чэрняхоўскім, усе прысутныя стоячы ўшаноўваюць памяць загінуўшых герояў.

— Наша Чырвоная Армія, — гаворыць у сваім дакладзе тав. Новікаў, — якая бязлітасна громіць ворага ў яго ўласным логаве, нястомна ідзе ўперад да цэнтра фашысцкай Германіі — Берліна. Нішто не можа стрымаць гэтага наступальнага парыву Чырвонай Арміі, таму што яе вядзе ў бой Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза тав. Сталін.

Пад бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты ўдзельнікі ўрачыстага паседжання паслалі прывітанне таварышу Сталіну. Пасля ўрачыстага паседжання адбыўся вялікі канцэрт.

У ДЗЕНЬ СВЯТА

Рабочыя абутковай фабрыкі імені Тэльмана ў дзень Чырвонай Арміі працавалі з асаблівым уздымам. Кожны з іх стараўся адзначыць слаўную гадавіну высокай выпрацоўкай і перавыкананнем зменных норм.

У часе абедзеннага перапынку рабочыя фабрыкі ажыўлена гутарылі аб загадзе таварыша Сталіна ў сувязі з 27-й гадавінай Чырвонай Арміі. Былы партызан тав. Смірноў (другі пашывачны цэх) заявіў:

— З вялікім хваляваннем слухаў я па радыё загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна. Я ганаруся тым, што ў цяжкія для нашай Радзімы дні я змагаўся ў партызанскіх радах супроць нямецкіх акупантаў. Цяпер, знаходзячыся ў тылу, я стараюся працаваць па-франтавому. Сваю норму, па заціяжным абутку, я выконваю на 250 процантаў.

СВЯТОЧНЫЯ ПАДАРУНКІ ФРАНТАВІКАМ

ВАЛКАВЫСК. Працоўныя раёна да дня 27-й гадавіны Чырвонай Арміі сабралі для франтавікоў 700 аўчын, 480 пар цёплых наскоў, 560 пар рукавіц і 150 шарфаў.

Салют Мінска

23 лютага 1945 года.

Гэта незабыўны дзень у жыцці працоўных сталіцы Совецкай Беларусі, гэта дзень салюта ва славу і чэсць Чырвонай Арміі, ва славу і чэсць яе доблесных воінаў і афіцэраў, яе генералаў і Вярхоўнага Галоўнакамандуючага вялікага Сталіна.

Громам артылерыйскіх залпаў, гірляндамі рознакаляровых ракет—самых прыгожых і самых цудоўных — сталіца Совецкай Беларусі ад імені яе гераічнага народа разам з любімай Масквой, Кіевам, Одэсай, Вільнюсам і другімі гарадамі славіла велічныя перамогі нашай Радзімы, гераізм і мужнасць пуда-багатыроў Чырвонай Арміі, якія пад вядзіцельствам роднага Сталіна вызвалілі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прынеслі нам свабоду і шчасце, адстаялі нашы права на жыццё і росквіт.

Гэта быў незабыўны вечар. Тысячы старых і маладых, дзяўчат і юнакоў выйшлі на вуліцы і плошчы, каб лепш бачыць, каб лепш чуць веліч і ўрачыстасць салюта. Кожны хацеў якімсьці чынам выказаць сваю ўдзячнасць нашым родным воінам, роднаму Сталіну.

Ніхто не звяртаў увагі на калючы холад. Усе радасныя і ўзбуджаныя. Напружана чакаюць.

І вось — дваццаць гадзін...

Гулам артылерыйскага залпа ўздрыгнулася замёрзшая зямля, уздрыгнулася і рассыпалася тысячамі зорак-ракет марозная ноч. Раз, другі, трэці і так да дваццаці. І з кожным залпам—выбухі радасці і лікавання шчаслівых людзей, воклічы славы і ўдзячнасці Чырвонай Арміі і яе палкаводцу.

І неба прасвятлілася, і мароз, здаецца, паменшыўся — так цёпла і радасна на сэрцы ў кожнага. У гэтым салюце мы чуем гром нашай ваеннай славы, у гэтым салюце мы бачым цудоўную веліч нашай перамогі.

ГУТАРКІ У ЧЫТАЛЬНІ

Як і заўсёды, надвячоркам, стары калгаснік Ружынскі Васілій Фролавіч зайшоў у чытальню. Прывітаўшыся, запытаў:

— Анастасія Фёдараўна, якія сёння навіны?

— О, дзядзька Васіль, сёння, як і кожны дзень, навіны цікавыя!

Загадчыца хаты-чытальні Анастасія Фёдараўна Пісьядкова разгарнула свежы нумар газеты «Звязда».

— Вось глядзіце: надрукаваны два загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна. Першы загад — камандуючаму войскамі 2-га Беларускага фронта Маршалу Совецкага Саюза Ракасоўскаму, другі— камандуючаму войскамі 3-га Беларускага фронта генералу арміі Чэрняхоўскаму.

— Якія-ж там гарады нашы сыночкі забралі? — нецярпліва перапытвае стары.

— А вось слухайце, — і хатнік голасна пачынае чытаць загады таварыша Сталіна.

Усе прысутныя, затаіўшы дыханне, слухаюць словы геніяльнага палкаводца. «Войскі 3-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 10 лютага, з баямі авалодалі горадам Прэйсіш Айлау— важным вузлом камунікацый і моцным апорным пунктам абароны немцаў ва Усходняй Прусіі...»

Анастасія Фёдараўна падыходзіць да карты Германіі, што вісіць на сцяне, і чырвоным алоўкам падкрэслівае пруські горад Прэйсіш Айлау. А калі яна скончыла чытаць загады, Васіль Фролавіч, уважліва ўглядаючыся ў карту, загаманіў:

— Значыцца, нашы спіскаюць прусакоў, пад ногаць іх бяруць. — І мае сыны, Пятрок і Яшка, у тым напрамку наступаюць. Пішуць — хутка прыкончаць гадаў.

Праціраючы кулаком вочы, ён зноў прыльнуў да карты.

— Скажы, Фёдараўна, колькі да Берліна асталося?

— Зусім блізка, — умешваецца ў размову Куйко Іван, — інвалід Айчыннай вайны, што тызень таму назад прыехаў са шпіталя на пабыўку дамоў, — кілометраў 80, а можа і 70.

— 70 кілометраў... гэта ў маладосці для мяне дванаццаць гадзін хады, — разважліва тлумачыць Васіль Фролавіч.—Але гэта — хады, ды яшчэ ўлетцы, без нічога. А з боем цяжка. Я хоць і не вазваў цяпер, але пераканаўся ў гэтым, калі немцаў сціснулі тут, каля Бешанковіч і каля нашай Свячы. Вы разумеце, трапіла погань у сапраўдную пастку, выйсці — ані шчыліны, а прабуе супраціўляцца. Мала гэтага — хаты паліць.

І Васіль Фролавіч расказаў даўно вядомы на ўсю ваколіцу выпадак. У вёсцы Свяча (калгас імені Кірава), што знаходзіцца на шасе Бешанковічы — Лепель, доўга стаяў нямецкі гарнізон. У часе імклівага наступлення Чырвонай Арміі ў чэрвені мінулага года гэты гарнізон, як і многія іншыя, трапілі ў Віцебскі «кацёл». Немцаў тут засталі знянацку, так што многія ўцяклі ў лес, пакінуўшы зброю. Засталіся ў вёсцы толькі факельшчыкі, сярод іх адзін унтэр. Гэтаму унтэру ўдалося запаліць хату. Пасля гэтага ён падбег да другой. Чырканув сярнічку, але не паспеў запаліць. З-за вугла на яго накінуўся стары калгаснік Васіль Фролавіч Ружынскі і задушыў унтэра.

— Я гэты выпадак расказаў вам, — у канцы размовы дадаў стары, — каб паказаць, як немцы-гадзюкі злыя на нас, і біць іх яшчэ трэба моцна...

Такія гутаркі ў Свечанскай хаце-чытальні можна пачуць часта. Амаль кожны вечар сюды збіраюцца калгаснікі, каб паслухаць навіны, пачытаць свежыя газеты, часопісы, падзяліцца думкамі.

Пры хаце-чытальні створан совет чытальні, у які ўваходзяць: загадчык свечанскай школы Аўчыннікава, настаўніца Рэкдарэнка, старшыня сельсовета Бучлінскі, фінагент Сухаміра Еўгенія і другія. Актыўны ўдзел у рабоце чытальні прымаюць дырэктар НСШ Семяніда, медсястра Іванова, калгаснікі-агітатары Амбразевіч Л., інваліды Айчыннай вайны Краско А., Куйко І. і другія.

За апошні час у чытальні праведзены гутаркі і даклады аб міжнародным становішчы, аб жыцці і дзейнасці Владзіміра Ільіча Леніна, аб паходжанні жыцця на зямлі, аб узнянці ўраджайнасці і г. д. Пры чытальні працуе гурток па вывучэнні кнігі таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза», працуюць харавы і драматычны гурткі. Хата-чытальня добра афармлена. На сценах — партрэты, лозунгі, вітрына з выразкамі партрэтаў Герояў Совецкага Саюза і Герояў сацыялістычнай працы. На сцяне вісіць насценгазета, якая выходзіць адзін раз у дзесяцідзённку. Яна нядрэнна асвятляе жыццё сельсовета. Паказвае падрыхтоўку калгасаў да сяўбы, работу школ, крытыкуе асобныя недахопы ў рабоце калгасаў.

На стале ў чытальні можна заўсёды знайсці падшыўкі газет «Правда», «Звязда», «Советская Белоруссия», «Віцебскі рабочы». Усё гэта плады клапатлівай працы загадчыка хаты-чытальні Анастасіі Фёдараўны Пісьядковай.

Гэтая хата-чытальня — актыўны памочнік у рабоце сельсовета. Свечанскі сельсовет, Бешанковіцкага раёна, з'яўляецца перадавым у раёне. Ён першым закончыў гаспадарчы год, выканаў і перавыканаў план хлебанарыхтовак, ільнавалакна, лесанарыхтовак. Паспяхова рыхтуецца да веснавой сяўбы. Сведчаннем гэтых поспехаў з'яўляецца пераходны Чырвоны сцяг РК КП(б)Б і райвыканкома, які атрымаў сельскі совет.

С. СВІРЫДАЎ.

Першы Беларускі фронт.
Калона гітлераўцаў, узятых у палон у раёне горада Пазнэнь, канваіруецца ў тыл.
Фото В. Пушкіна (Фотахроніка ТАСС).

ЛЯСНАЯ ГАСПАДАРКА БССР

Багата Беларусь лясамі. Велізарныя пушчы, шумлівыя бары, вясёлыя гаі і дубровы цягнуцца ад заходніх граніц з-пад Буга на ўсход да басейна Сожа і прытокаў Дняпра, ад Віцебшчыны і на поўдзень да граніц Украінскай ССР. Хвоя, ёлка, дуб, бяроза, ясень, клён, альха, асіна і многія другія дрэвы добра растуць на беларускай зямлі.

Лясы ў нашай рэспубліцы займаюць плошчу звыш 5 мільёнаў гектараў.

Да пачатку Айчыннай вайны лясная гаспадарка рэспублікі знаходзілася ў добрым стане. На вырубленых плошчах праводзіліся новыя пасевы і пасаджэнні. Толькі на працягу 1939—40 гадоў па БССР было засеена і пасаджана 54 тысячы гектараў хутка растучых каштоўных парод, як веймутава хвоя, ліственіца, топаль, бархат амурскі і другія.

Нямецка-фашысцкія акупанты нанеслі вялікія шкоджанні і страты лясной гаспадарцы. Гітлераўцы па-драпежніцку знішчалі лясы. За час свайго панавання яны высеклі 36 тысяч гектараў лесу паабапал чыгуначных, шасейных і грунтавых дарог, па берагах рэк, па-варварску высеклі 75 тысяч гектараў, спалілі лес на плошчы ў 140 тысяч гектараў і прывялі да захламленасці 162 тысячы гектараў лясоў. Страты, нанесеныя немцамі лясной гаспадарцы, перавышаюць паўтара мільярда рублёў.

Зараз пачалося ўшчадкаванне і адраджэнне лясной гаспадаркі рэспублікі. Адноўлена 5 і створана 7 новых тэрытарыяльных упраўленняў лесааховы. Працуюць ужо 85 лесгасаў і 527 лясніцтваў.

Адноўлен і пачаў працаваць у Гомелі Беларускі навукова-даследчы інстытут лясной гаспадаркі. Працуюць тры апорна-навуковыя станцыі — Веляніцкая, Горацкая і Жорнаўская. Адноўлен Полацкі лясны тэхнікум. Арганізаван новы лясны тэхнікум у Буда-Кашалёве. Працуе многа курсаў па падрыхтоўцы ляснічых, аб'ездчыкаў, майстраў лесанасаджэнняў і іншых спецыялістаў.

Упраўленне па ахове і лесанасаджэнню пры Соўнаркоме СССР па БССР распрацавала мерапрыемствы на бліжэйшыя гады па адраджэнню лясной гаспадаркі Беларусі. На працягу пяці год мяркуецца адпавіць 300 тысяч гектараў лясоў. З гэтага ліку на плошчы 100 тысяч гектараў будуць пасаджаны і пасеяны хуткарастучыя і цвёрдыя пароды—топаль, дуб, клён, ясень, ліственіца, берасклет і іншыя.

У гэтым годзе ствараюцца пітомнікі на плошчы 126 гектараў, матачныя плантацыі топаля—75 гектараў і плантацыі берасклета барадаўчатага—50 гектараў. Берасклет барадаўчаты—каштоўнае дрэва, з карэнняў якога здабываецца каштоўная і высокаякасная сыравіна—гума. У гэтым годзе і ў далейшым лясныя гаспадаркі нарыхтуюць вялікую колькасць карэнняў берасклета.

Лесгасы пачалі нарыхтоўку насення дрэў. Зараз збіраюцца хваёвыя шышкі. У гэтым годзе намечана нарыхтаваць 60 тон насення хваёвых і ліственых парод.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 23 лютага. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што ў Германіі войскі саюзнікаў уступілі ў Майланд (на паўднёвым усходзе ад Клеве).

На ўсходзе ад пункта перасячэння бельгійскай, люксембургскай і германскай граніцы войскі саюзнікаў ачысцілі Бінсшэйд і Ліхтэнборн.

Войскі саюзнікаў занялі Віандэн, завяршыўшы такім чынам поўнае ачышчэнне Люксембурга ад праціўніка. На ўсходзе ад Віандэна саюзнікі занялі Гейхлінген і Обергеклер. Войскі саюзнікаў ачысцілі ад праціўніка трохвугольнік у раёне рэк Саар і Мозель, заняўшы пры гэтым гарады Фелерыг і Таверн, а таксама заходнюю частку Саарбурга. На поўдні ад Саарбурга войскі саюзнікаў фарсіравалі раку Саар у двух мясцах і ўступілі ў Зэрыг, размешчаны на ўсходнім беразе ракі Саар.

22 лютага буйныя злучэнні самалётаў саюзнікаў зрабілі масіраваныя налёты на сістэму камунікацый праціўніка, а таксама атакавалі транспартныя аб'екты ў паўночнай Галандыі і ў заходняй Германіі.

Цяжкія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на камунікацыі праціўніка ў цэнтральнай і паўднёвай Германіі, Аўстрыі і Паўночнай Італіі.

ЛОНДАН, 23 лютага. (ТАСС). У паведамленні штаба ўзброеных сіл саюзнікаў на міжземнаморскім тэатры ваенных дзеянняў гаворыцца, што ў Італіі амерыканскія часці 5-й арміі, пераадольваючы рашучае супраціўленне праціўніка на захадзе ад шасе Балонія—Пістоя, прадаўжалі паляпшаць свае пазіцыі. Рад контратак праціўніка быў адбіт. На правым флангу бразільскія часці 5-й арміі занялі важнае ўзвышша Кастэла. На ўчастку 8-й арміі актыўна дзейнічалі патрулі.

НАЛЁТ АНГЛІЙСКАЙ АВІЯЦЫІ НА БЕРЛІН

ЛОНДАН, 23 лютага. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у ноч на 23 лютага, англійскія бамбардыроўшчыкі «Маскіта» зрабілі налёт на Берлін.

У арганізацыйным камітэце Сусветнай прафсаюзнай арганізацыі

ЛОНДАН, 22 лютага. (ТАСС). Як перадае англійскае міністэрства інфармацыі, адбылося паседжанне арганізацыйнага камітэта, створанага Сусветнай прафсаюзнай канферэнцыяй. Абмяркоўваліся метады выканання рашэнняў канферэнцыі. У адпаведнасці з планам, прынятым на канферэнцыі, быў створан адміністрацыйны камітэт. У яго састаў увайшлі: ад СССР—Кузняцоў, Тарасаў і намеснікі Сідарэнка і Салаўёў; ад Францыі—Сайян і Фрашон; ад Англіі—Эдвардо і Вальтэр Сітрын, намеснік Дзікін; ад ЗША—Хілмэн, намеснік Томас; ад Лацінскай Амерыкі—Ломбардо Толедано і Кофіно, намеснік Карыльо, а таксама прадстаўнікі Кітая, міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў і міжнароднага прафесіянальнага сакратарыята.

ДА ПЕРАГАВОРАЎ ПАМІЖ ГАМІНДАНАМ І КІТАЙСКАЙ КОМПАРТЫЯЙ

ЧУНЦІН, 22 лютага .(ТАСС). 17 лютага лідэр кітайскай комуністычнай партыі Чжоу Эньлай, пасля трохтыднёвага прабывання ў Чунціне, выехаў у Яньань. З яго ад'ездам закончылася яшчэ адна фаза перагавораў паміж Кітайскай компартыяй і Гаміндананам. Мяркіх вынікаў перагаворы не далі. Абодва бакі стаяць на прынцыпова процілеглых пазіцыях. Асноўныя прапановы компартыі можна звесці да трох пунктаў: 1) Скасаваць дыктатуру Гаміндана; 2) Неадкладна склікаць канферэнцыю ўсіх партый і палітычных груп для абмеркавання пытання аб падрыхтоўцы да склікання нацыянальнага схода; 3) Утварыць кааліцыйны ўрад на базе шырокай дэмакратыі і аб'яднання ўсёй краіны ў інтарэсах вайны супроць Японіі.

Гаміндан, адмаўляючыся прыняць прапанову компартыі «аб завяршэнні першай апекі», са свайго боку прапануе перад скліканнем нацыянальнага схода склікаць міжпартыйную нараду (орган дарадчага характару) у рамках выканаўчага юаня (палаты) для абмеркавання розных бягучых палітычных пытанняў, падпарадкаваць камандаванню цэнтральнага ўрада ўзброеныя сілы, якімі кіруе компартыя, і рэарганізаваць іх, пасля чаго за компартыяй будзе прызнана права легальнага існавання.

Спробы прымаўшага ў перагаворах удзел амерыканскага пасла Хэрлі вырашыць пытанне кампрамісам аказаліся дарэмнымі.

ВАЙНА НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

ЛОНДАН, 23 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне штаба аб'еднанага камандавання ўзброенымі сіламі саюзнікаў у паўднёва-заходняй частцы Ціхага акіяна аб тым, што амерыканскія войскі высадзіліся на востраве Капуль, размешчаным у праліве Сан-Бернардзіна паміж астравамі Лусон і Самар. Японскія войскі аказалі слабае супраціўленне. Востраў Капуль займае важнае становішча таму, што міма яго праходзіць галоўны шлях, які вядзе у Манільскую бухту.

Амерыканскія войскі прадаўжаюць аперацыі па знішчэнню японскіх часцей у паўднёвай частцы Манілы. Другія амерыканскія часці прасоўваюцца на паўднёвы ўсход ад горада.

БАІ Ў ЮГАСЛАВІІ

Белград, 21 лютага. (ТАСС). У паведамленні вярхоўнага штаба Народна-вызваленчай арміі Югаславіі гаворыцца, што югаслаўскія часці пасля ўпорных жорсткіх баёў занялі Зворнік. Узмоцненая нямецкая дывізія, якая дзейнічала ў гэтым раёне, амаль поўнасцю разгромлена. Толькі нязначным рэшткам дывізіі ўдалося прарвацца з акружэння. Выведзена са строю звыш 8.500 нямецкіх салдат і афіцэраў, не лічачы страт, якія дывізія панесла раней. Узяты вялікія трафеі.

У сектары Траўніка югаслаўскія часці, адбіўшы жорсткія атакі ворага, перайшлі ў контрнаступленне, вызвалілі Траўнік і цэлы рад другіх населеных пунктаў. Прадаўжаліся баі па ліквідацыі акружанага варожага гарнізона ў Коньіцэ.

ДАНЯСЕННЕ «ПАСЛА» МУСАЛІНІ АБ СТАНОВІШЧЫ Ў БЕРЛІНЕ

ЛОНДАН, 21 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне швейцарскай газеты «Сюіс» аб тым, што італьянскія партызаны перахапілі сакрэтнае паведамленне, накіраванае Мусаліні яго «паслом» у Берліне Філіпа Анфузо. Гэта паведамленне асвятляе становішча ў Берліне.

«Становішча ў Берліне надзвычай трагічнае, — гаворыцца ў паведамленні, — але немцы так знясілены фізічна і маральна, што выключана магчымасць паўстання. Жудасны фінансавы крызіс абясцэніў нямецкія цэнныя паперы, грошы зусім страцілі сваю цэннасць. Выключна многа салдат дэзертыруе з нямецкай арміі, і ваенна-палявыя суды штодзённа судзяць сотні дэзертыраў».

У заключэнне Анфузо заяўляе, што сілы немцаў убываюць з кожнай гадзінай.

РУМЫНСКІЯ «ЛЕГІЯНЕРЫ» РАНІЛІ СТАРШЫНЮ РУМЫНСКАЙ КАНФЕДЭРАЦЫІ ПРАЦЫ

БУХАРЭСТ, 22 лютага. (ТАСС). 20 лютага на заводзе «Малакса» ў Бухарэсце групай узброеных «легіянераў» (фашыстаў), якія прабавалі захапіць завод, быў цяжка ранен выстралам у жывот старшыня румынскай канфедэрацыі працы Георгій Апостал.

БАМБАРДЫРОЎКА БЕРХТЭСГАДЭНА

ЛОНДАН, 23 лютага. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне штаба міжземнаморскіх сіл саюзнікаў аб тым, што 20 лютага ўпершыню з пачатку вайны быў падвергнут бамбардыроўцы Берхтэсгадэн—сельская рэзідэнцыя Гітлера.

Адказны рэдактар
В. САМУЦІН.

Спаборніцтва двух калгасаў

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). У мінулым годзе калгаснікі сельгасарцелі «Калектывіст», Мазырскага раёна, спаборнічалі са сваім суседам—калгасам імені Ракасоўскага. Спаборніцтва двух калгасаў з'явілася магутным сродкам па хутчэйшаму адраджэнню арцельных гаспадарак. Так, калгас «Калектывіст» у першы год пасля вызвалення ад немцаў дабіўся сярэднягa ўраджаю збожжавых культур—11 цэнтнераў з гектара, гародніны — каля 400 цэнтнераў. Атрыман таксама высокі ўраджай бульбы. Татэрмінова выканаўшы дзяржаўныя збожжапастаўкі, калгас здаў у фонд Чырвонай Арміі 360 пудоў хлеба і 940 пудоў гародніны.

Старанная праца калгаснікаў добра аплочана. Пры канчатковым разліку на кожны працадзень калгаснікі атрымалі па 3 кілограмы хлеба, 3,6 кілограма бульбы і гэтулькі-ж гародніны, па 1,5 кілограма сена і на 16 рублёў грошай. Сям'я калгасніка Ільі Таруна, якая складаецца з трох працаздольных, атрымала на свае працадні 2.001 кілограм хлеба. 10.686 рублёў грошай, 4.672 кілограмы бульбы і гародніны, і 1.068 кілограмаў сена. Многа прадуктаў і грошай атрымалі і іншыя сем'і калгаснікаў.

Нядрэнных вынікаў за год вольнай працы дабіліся і калгаснікі сельгасарцелі імені Ракасоўскага. Тут таксама атрыман высокі ўраджай, адноўлены тры жывёлагадоўчыя фермы.

У пачатку гэтага года калгаснікі гэтых двух арцелей рашылі прадоўжыць сацыялістычнае спаборніцтва. У новым дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва калгаснікі абавязаліся павялічыць ураджайнасць збожжа на два цэнтнеры з гектара супроць мінулага года, давесці пагалоўе жывёлы на фермах да даваеннай колькасці і поўнасцю ліквідаваць сляды нямецкай акупацыі.

Барацьба за выкананне ўзятых абавязацельстваў разгарнулася з першага дня заключэння дагавора. Цяпер у абодвух гэтых калгасах закончаны асноўныя падрыхтоўчыя работы да веснавой сяўбы: адраманцтван інвентар, ачышчана насенне, створаны звенні высокіх ураджаяў, за якімі замацаваны ўчасткі зямлі, цягло давезена да сярэдняй і вышэйсярэдняй укормленасці, на ўсіх коней падрыхтавана і адраманцтавана добрая збруя. У калгасах ідзе вывазка на палі гною, ідзе накапленне попелу, птушынага памёту і іншых мясцовых угнаенняў.

А. ЛЯСНЫ.

НА ЗАВОДЗЕ СЕЛЬГАСМАШЫН

ЛІДА. (Кар. «Звязды»). Завод, дзе дырэктарам тав. Макесў, увайшоў у строй дзеючых з 1 жніўня 1944 г. У першы-ж месяц работы ён выпусціў 64 сельгасмашыны. У далейшым выпуск гатовай прадукцыі ўвесь час павялічваўся.

У кастрычніку мінулага года на гэтым прадпрыемстве было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва, уведзена здельная аплата працы. Дзякуючы гэтаму значна ўзрасла прадукцыйнасць. Так, вытворчы план у кастрычніку быў выканан на 117 процантаў. Процант выканання плана з месяца ў месяц павышаўся. У лістападзе план быў выканан на 124,3 процанта, а ў снежні—на 129.

Яшчэ больш паспяхова справіўся з сваёй работай завод у студзені. Вытворчую праграму за першы месяц новага года ён выканаў на 134 процанты. Пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве трымае зборачны пэх, дзе майстрам тав. Кучанікідзе. Лепшыя рабочыя завода тт. Васільеў, Увараў і другія дабіліся значнага перавыкання норм выпрацоўкі.

У сувязі з павелічэннем вытворчай праграмы 1945 года многія рабочыя механічнага пэха перайшлі на двухстаночную работу. Чатыры токары—тт. Ясельскі, Гебін, Жуеўскі, Рахліна абслугоўваюць 8 такарных станкоў і штодзённа перавыконваюць свае заданні.

На прадпрыемстве рэгулярна праводзіцца праверка сацыялістычнага спаборніцтва. Выпікі работы за дзень заносяцца на пэхавыя дошкі выканання норм выпрацоўкі, а на станкі лепшых стаханаўцаў прымацоўваецца пераходны чырвоны сцяжок. Цэхі і стаханаўцы, якія вызначыліся за дзень, заносяцца на заводскую дошку гонару.

Адначасова з выпускам сельгасмашын ідзе далейшае аднаўленне завода. Многія абавязацельствы, узятыя калектывам па хутчэйшаму адраджэнню прадпрыемства, ужо выкананы. Так, на 10 дзён раней намечанага тэрміну закончана будаўніцтва памяшкання машыннага аддзялення і па 4 дні раней пушчан у ход заноў устаноўлены лакамабіль.

Вялікая ўвага ўдзяляецца на прадпрыемстве пытанню падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Зараз на заводзе ёсць 25 вучняў, якія навучаюцца рознастайным спецыяльнасцям.

Апрача асноўнага асартымента, завод звыш плана выпускае тавары шырокага спажывання.

Выпускаемыя гэтым прадпрыемствам плугі, саламарэзкі, малатарні, веялкі, прывады, восі для пялег, льномялкі, сартыроўкі для бульбы ідуць у першую чаргу для патрэб раёнаў, пацярпеўшых ад фашысцка-нямецкіх захопнікаў.

Г. ЯСЮЦІН.

Добраякасна адраманцтавалі трактары

За мінулы год мая брыгада значна перавыканала план работ, з'эканоміўшы пры гэтым звыш тоны гаручага. За ўвесь час палявых работ ні адзін трактар не выйшаў са строю. Гэта вынік таго, што трактары добраякасна былі адраманцтаваны.

Вось чаму яшчэ з восені мы пачалі рыхтавацца да асенне-зімовага рамонту машын. Разам з кавалём Сяргеем Клопатарым і слесарамі Герасімам Карпекіным і Міколам Сакаловым рэстаўрыравалі валікі клапаннага механізма і многія іншыя часткі. Цяжка было дастаць радыятары, якія на трактарах знасілены. Але мы выйшлі з гэтага становішча—знялі радыятары з трафейных падбітых нямецкіх танкаў і прыстасавалі іх да трактараў. Такім-жа чынам прыстасавалі падшыпнікі для хадавых колаў.

Мая брыгада па рамонце трактараў заняла пяршынства ў МТС. Мы закончылі рамонт 4 трактараў, з якіх 2 адраманцтавалі капітальна. Якасць рамонту трактараў прызнана камісіяй добрай.

Цяпер мая брыгада паспяхова рамантуе прычэпны інвентар, які ў бліжэйшы час будзе поўнасцю гатоў.

Змітрок **ГОБРЫКАЎ**,
брыгадзір 4-й трактарнай брыгады,
Горацкай МТС.

Растуць новыя дамы

БЫХАЎ. (Кар. «Звязды»). Над старым Дняпром на папялішчах вырастаюць новыя дамы, грамадзкія будынкі, цэлыя вёскі. На схілістым беразе стаіць калгасная Віляхаўка. Яе, як і дзесяткі іншых вёсак, спалілі нямецкія акупанты. Але калгаснікі паспяхова адбудоўваюць сваю вёску. Тут пабудавана ўжо звыш 30 новых і адраманцтавана 20 разбітых дамоў калгаснікаў. У першую чаргу дамы будуюцца і раманцтуюцца для сем'яў франтавікоў.

Калгаснікі сельгасарцелі «Маяк комуны» рашылі закончыць адбудову сваёй вёскі ў гэтым годзе. Для гэтай мэты тут створана будаўнічая брыгада, якая налічвае 25 чалавек. Брыгадай кіруе вопытны цясляр Ілья Старавойтаў.

Будаўнічыя брыгады створаны ва ўсіх калгасах раёна. За мінулы месяц гэтымі брыгадамі адбудавана 400 новых дамоў і 130 зрубаў, а таксама нарыхтавана вялікая колькасць лесаматэрыялаў.

М. ЯРАВЫ.

У чэсць слаўнай гадавіны

МАЛАРЫТА. Уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва імені 27-й гадавіны Чырвонай Арміі, сяляне Масевіцкага сельсавета датэрмінова выканалі план лесанарыхтовак першага квартала.

ІВАНАВА. Працоўныя раёна правялі збор падарункаў для слаўных абаронцаў Радзімы. На фронт яны адправілі 100 кілограмаў масла і мёду, 350 жараных курэй, 100 кілограмаў сушаных фруктаў, 4.600 яек і апрача гэтага 800 індывідуальных пасылак.

ПУХАВІЧЫ. Буйнымі вытворчымі перамогамі сустрэў свята Чырвонай Арміі калектыў Пухавіцкай МТС. На 40 дзён раней тэрміну тут скончан рамонт трактараў і прычэпнага інвентару. Усе трактары, плугі, сеялкі, культыватары, бораны прыняты Дзяржаўнай прыёмачнай камісіяй з ацэнкай «добра» і «выдатна». У рамонтных работах вызначыліся трактарысты тт. Лукашок, Смоляк, Жаўнерчык. Яны з дня ў дзень давалі па дзве нормы.

КРЫЧАЎ. У горадзе праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі. У парткабінеце падрыхтаван фотамантаж і выстаўка літаратуры аб Чырвонай Арміі. Ва ўстановах і прадпрыемствах выйшлі святочныя нумары насценгазет, усюды вывешаны лозунгі, плакаты. У калгасах і соўгасах праведзены ўрачыстыя паседжанні.

ЦЕРАХОЎКА. Калектыў Церахоўскай МТС абавязаўся да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі датэрмінова выканаць гадавы план рамонту трактараў. Сваё слова трактарысты і рабочыя стрымалі з чэсцю, датэрмінова адраманцтаваўшы ўсе прадугледжаныя планам 14 машын.

Зараз калектыў Церахоўскай МТС узяўся адраманцтаваць яшчэ 9 трактараў звыш плана.

(БЕЛТА).

ВЫКАНАЛІ ЛЮТАЎСКІ ПЛАН

Заводы Белгалоўзагспірта студзеньскі план выканалі на 114 процантаў. 27-ю гадавіну Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота заводы Белгалоўзагспірта сустрэлі выкананнем лютаўскай праграмы.

Уперадзе ідзе Баранавіцкі спіртатрэст (дырэктар тав. Суворaў). У студзені месяцы трэст выканаў план на 165 процантаў, а праграму гэтага месяца поўнасцю закончыў 20 лютага. Адначасова з паспяховым выкананнем вытворчых заданняў заводы трэста разгарнулі падрыхтоўку да торфсезона. Арганізаваны курсы дзесятнікаў, рыхтуецца розны інвентар, патрэбны для здабычы торфу.

Сёння ў тэатрах і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычны тэатр імені Янкі Купалы
«ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ»
Пачатак у 19 гадзін.

Кінотэатр «Першы»
КІНОФЕСТЫВАЛЬ
«ДА ПЫТАННЯ АБ ПЕРАМІР'І З ФІНЛЯНДЫЯЙ»

Кінотэатр «Беларусь»
«МАЛАХАЎ КУРГАН»

Кінотэатр «Радзіма»
«У ШЭСЦЬ ГАДЗІН ВЕЧАРА ПАСЛЯ ВАЙНЫ»

Мінгорхарчгандаль

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН ГОРАДА МІНСКА, ШТО ПРЫМАЦАВАННЕ ДА МАГАЗІНАЎ МІНГОРХАРЧГАНДЛЯ НА САКАВІК МЕСЯЦ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА З 28 ЛЮТАГА ПА 7 САКАВІКА УКЛЮЧНА.

Прымацаванне будзе праводзіцца па спісах устаноў, прадпрыемстваў і домакіраўніцтваў.

АСОБЫ, якія не паспелі па якіх-небудзь прычынах прымацавацца да ўказанага тэрміну, МОГУЦЬ ПРЫМАЦАВАЦЦА ДА НАСТУПНЫХ ДЗЯЖУРНЫХ МАГАЗІНАЎ, БЕЗ ПРАДСТАЎЛЕННЯ СПІСАЎ:
магазін № 18—Усходняя, 37.
» № 8—пасёлак «Комінтэрн».
» № 27—вуліца Чкалава, 39.

Дырэкцыя.

Да ўвагі галоўных бухгалтараў прадпрыемстваў і ўстаноў.

Згодна інструкцыі Народнага камісарыята фінансаў Саюза ССР № 153
«АБ УМОВАХ І ПАРАДКУ РАСПАЎСЮДЖАННЯ ТРЭЦЯЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЕННАЙ ПАЗЫКІ»,
У ДРУГОЙ ПАЛАВІНЕ ЛЮТАГА МЕСЯЦА 1945 г. ЗАКАНЧВАЕЦЦА ТЭРМІН АПЛАТЫ ПАДПІСКІ ПА ТРЭЦЯЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЕННАЙ ПАЗЫЦЫ.

У сувязі з гэтым усе прадпрыемствы і ўстановы

ПАВІННЫ ДА 25 ЛЮТАГА ЗРАБІЦЬ ВЫВЕРКУ РАЗЛІКАЎ ПА ПАЗЫЦЫ З ЦЭНТРАЛЬНЫМІ (раённымі) АШЧАДНЫМІ КАСАМІ (па месцу правядзення разлікаў), А ТАКСАМА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫДАЧУ АБЛІГАЦЫЙ ПАДПІСЧЫКАМ АДНАЧАСОВА З ВЫДАЧАЙ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ ЗА ДРУГУЮ ПАЛАВІНУ ЛЮТАГА МЕСЯЦА 1945 г.

НЕРАЗДАНЫЯ АПЛОЧАНЫЯ АБЛІГАЦЫІ ПАДПІСЧЫКАЎ, ЯКІЯ АДСУТНІЧАЮЦЬ, ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗДАНЫ У ЦЭНТРАЛЬНУЮ АБО РАЕННУЮ АШЧАДНУЮ КАСУ ПРЫ ІМЯННЫХ СПІСАХ.

Упраўленне дзяржпрацашчадкас
і дзяржкрэдыта Беларускай ССР.

АТ 28664 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.